— Во многих хозяйствах республики теплицы, где когда-то выращивали цветы, пребывают в запустении. Некоторые из них можно было бы застеклить и выращивать там цитрусы, которым зимой тепла нужно намного меньше, чем цветам. Глядишь, если не плодами, то хотя бы рассадой можно было бы обеспечить всю Беларусь, — считает Антон Иванович.

В Западной Европе, да и в России, цитрусоводство очень популярно. Кто не слыхал о «Павловском» лимоне? А его вывели селекционеры-самоучки из города Павлово-на-Оке. Может быть, когда-нибудь появится лимон «минский» или апельсин сорта «Беларусь», выведенный Алёхной или другими цитрусоводами?

— Главное, в новой оранжерее появилась площадь под новые виды растений, — Антон Иванович настроен оптимистично. — Можно проводить различные научные эксперименты.



Ведь цитрусовые очень пластичные растения и легко скрещиваются. А еще мечтаю вырастить дерево, на каждой ветке которого будут вызревать плоды разных видов. Подобное дерево Дружбы, на котором десятки прививок сделаны руками известных людей, растет в Сочинском ботаническом саду.

В оранжерее все продумано до мелочей. Аккуратные дорожки из плитки, в центре — бассейн для поддержания влажности и полива. План проекта нарисовал и претворил в жизнь сам Алёхна. Очень кстати и новейшие достижения техники. Как только в оранжерее становится слишком жарко, автоматически открываются фрамуги.

— А как с вредителями боретесь? Или их не бывает, уж больно у растений цветущий вид? — поинтересовались мы.

— Бывает, попадают с улицы белокрылка, паутинный клещ и прочая прожорливая мелюзга, — улыбается Алёхна. Так мы, чтобы поменьше «химичить», закупаем у лаборатории биологического метода защиты растений хищных насекомых — энкарзию и фитосейлиус. Очень эффективно действует.

О цитрусовых Антон Иванович может рассказывать часами.

— Вот это каламондин, — показывает наш гид на деревце с небольшими оранжевыми плодами, похожими на мандарины. — Что интересно, их едят вместе с кожурой.

Наше внимание переключается на другое удивительное растение.

— «Рука Будды» — очень редкий вид цитрона — продолжает Алёхна. —Свое название получил из-за формы плодов, напоминающей классическую позицию руки великого философа с указательным пальцем и мизинцем, указывающими вверх. Это растение с сильным и ароматным запахом, поэтому подносится в фарфоровых чашах перед алтарями божеств на празднование Нового года и во время других религиозных праздников на Востоке.

Возле дерева с табличкой «Пандероза» мы невольно залюбовались лимонами. Не лимоны — богатыри! Диаметром сантиметров двадцать и весом около килограмма.

— А это не совсем лимон, — поясняет Алёхна. — Пандероза — гибрид лимона с грейпфрутом. А у помпельмуса плоды и покрупнее бывают.

Полные впечатлений, благодарим за увлекательный рассказ и прощаемся. В Юго-Восточной Азии цитрусовые символизируют благополучие. Его и желаем главному белорусскому цитрусоводу. А саду — цвесть!

Сергей МАКАРЕНКО.
Фото Глеба ЛОБОДЕНКО.

Алатырь-камни

Давным-давно, когда по нашей земле медленно ползли ледники — гости северных широт — вместе с ними двигались другие пришельцы — огромные камни. Ледник откалывал их от скандинавских скал, выворачивал со дна варяжского моря и, как исполинский бульдозер, толкал их перед собой, медленно и упрямо двигаясь к южным широтам. Постепенно он набирал так много камней и песка, что они залезали к нему наверх, заставляли его зарываться в глубь земли. Потом наступило потепление, и ледник стал понемногу отступать. От ледяной брони, многометровым панцирем покрывавшим огромное пространство, оставались медленно тающие сухопутные айсберги. Песок и камни, которые были наверху, с талой водой стекали или обрушивались вниз, образуя живописные холмы. Потоки талых вод образовывали русла ручьев и рек, глыбы льда, загнанные под землю, стали резервуарами пресной воды, другие — нынешними озерами. А каменные бесформенные обломки северных скал сделались белорусскими валунами, обточенными во время долгого пути со всех сторон так, как волны моря обтачивают гальку.

А как возникла сама планета? Из космической пыли, втянутой в водоворот на поверхности беспредельного космического океана, постепенно все более сгущаясь и уплотняясь за счет движения, давления, температуры, рождается во вселенной новая планета — словно волшебный цветок загорается в темной ночи. Но если разобраться, то все эти чудесные цветы божественного космического сада — это ведь живые и, по сути, каменные цветки! Что такое магма внутри нашей планеты, как не тот же расплавленный камень? И чем станет вышедшая на поверхность магма, как не застывшей каменной массой? Опять же — камнем. Выходит, что он и есть тот информационный сгусток, образованный первовеществом, из которого в конечном счете и сотворен наш видимый материальный мир.

И вот лежат теперь повсюду на Беларуси загадочные валуны, молчат, хранят в себе тайны поистине космической глубины! Может быть, внутри них хранится крохотная частичка какого-то далекого мира, где никогда не было войн, где всегда царствует гармония и красота в душах счастливых и мудрых существ, населяющих его. Мечутся, рыскают беспокойные атомы внутри бездвижного холодного камня, словно пытаются рассказать нам о том, как много необыкновенного и прекрасного видели они на своем долгом космическом пути, прежде чем оказаться закованными в холодный панцирь белорусского валуна. Он мог бы поведать о многом! О том, что все в мире устроено по законам красоты и гармонии — во всех безднах бездн необъятного космоса.

С древнейших времен на всей планете существовали связанные с камнями верования. Такие культы, по словам ученых, были еще в Древних Египте, Греции, Риме... На площади Афин стоял камень с посвящением «Неведомому богу». Кто не знает о мегалитах Стонхенджа, загадочных дольменах и кромлехах, каменных бабах на необъятных просторах азиатских и причерноморских степей? Культы, связанные с камнями, были и у славян, отголоски их сохранились до наших дней. Среди населения, жившего на территории нынешней Беларуси, тоже было широко распространено верование в целебные и живительные свойства камня. Считалось, что перунов камень («громовая стрелка», песок, спекшийся от удара молнии), положенный женщине на живот, делает ее плодовитой и охраняет от злых духов. Позже люди стали верить в защитные и лечебные качества каменных топоров, изготовленных их далекими предками и обнаруживаемых иногда во время пахоты на полях, так как считалось, что они тоже упали с неба.

Частицы камня, почитавшегося в той или иной местности священным, или растительности, на нем растущей, перетирали в порошок, разводили с водой и пили как лекарство. Целебной считалась дождевая вода, собранная из выемок-«следков» на поверхностях камней, называемых «следовиками». Считалось, что прикосновение к священным камням возвращало человеку утраченное спокойствие, вносило мир в мятежную душу. Существуют легенды, согласно которым в основание городов закладывались особые камни, как бы своеобразные духовные магниты. Очень часто по окраинам деревень клали валуны, которые образовывали в пространстве крест, игравший роль оберега — защитника от всяких напастей. Из камня вытесывались фигуры языческих божеств, а позднее — христианские кресты, алтари. Интересно, что у каменных идолов и древних христианских крестов, как правило, были собственные имена. Известны идолы «Триглав», «Елуп», «Царь Давид», «Стод», и кресты с именами «Станкруль», «Скорпион», «Екатеринин крест», «Макеевский крест». Широко известны так называемые «Борисовы камни» с выбитыми на их поверхностях крестами и обращениями князя Бориса к Господу. На Оршанщине есть валун «Семигаюн». Возле деревни Кременец Логойского района лежит камень «Божий следок». Легенды об иных валунах утверждают, что они неким образом указывают на места спрятанных кладов. В частности, «Тупальщинский камень» на Сморгонщине, как говорят, является ключом к нахождению спрятанных шведами еще во время Северной войны лодки и телеги, доверху наполненных награбленным ими золотом. Многие камни больших размеров связаны с именами известных исторических личностей: князей, королей, императоров. Есть на нашей земле и «Камень Марины Мнишек», и «Иосафатов камень» («Камень Кунцевича»), и камни со следами Христа, Богородицы (Святой Панны), Святого Николая, Святого Петра и Святой Магдалены... Некоторые из них являются почитаемыми христианскими святынями, над иными из

них построены часовни. Немало есть у нас и «мастеровых» камней: «камни-швецы», «краўцы» — это или окаменевшие хаты жадноватых ремесленников, которых бог наказал за работу «ў Вялікдзень», или они сами, окаменевшие; но чаще такой валун-«швец», согласно преданиям, мог мастерски исполнить пожелание заказчика, что называется, на любой вкус. Диалектизм этой полной противоречий жизни выразился в том, что наряду со священными камнями и «камянямі кахання», немало и так называемых чертовых камней. Сохранились валуны со следами дьявола (даже один со следом дьявола-обжоры), есть «Змеев камень», «Вужыны камень». Возле деревни Сенежицы Новогрудского района лежит камень с двумя следами — один якобы от ноги Богородицы, а другой — гнавшегося за ней черта (впрочем, по другой версии, следы на этом камне — тайные знаки все тех же шведов). Встречаются еще и валуны с именами языческих божеств — Перуна, Даждьбога, Велеса.

Нередко поля, усыпанные огромными камнями, выглядят как места какого-то богатырского сражения. И в самом деле народные предания связывают многие валуны с древними богатырями, волотами, жившими в незапамятные времена на нашей земле. Многие камни считаются окаменевшими волотами, часть из них имеет собственные имена: «Волат», «След Волата», «Асілак». Кое-где о культовых валунах рассказывают, что во время дождей они остаются совершенно сухими, а по ночам над ними появляется таинственный свет, иногда даже огонь!..

Да, не так они просты, как это иной раз нам кажется, эти северные пришельцы! Они могут представлять интерес не только для геологов или строителей. Ведь согласитесь: гораздо интереснее жить в стране, полной древних преданий обо всем, что нас окружает: о живой воде криниц и ручьев, царях-дубах, каменных богатырях, нежели скользить равнодушным взглядом по тем же валунам — представителям «неживой природы». Порасспрашивайте-ка стариков, а вдруг найдется еще среди них тот, кто начнет свой с вами долгий разговор, как древний сказитель, со слов: «Как на море-океане есть остров, на острове том растет дуб-великан, а под дубом тем лежит камень — бел-горюч Алатырь-камень!..» Сколько интереснейших вещей остается порой вне поля нашего зрения, сколько чудных преданий забыто, сколько священных древних камней утеряно безвозвратно!

Александр КАМЕНЧУКОВ.

ГРАНАТ — камень вернасці і сілы

Гранат мае складаны лёс. Яго роля ў гісторыі культуры каменю зведала ўзлёты і падзенні, над ім заўжды ўладарыла ўсемагутная капрызная мода. Гэта адбывалася таму, што да гранатаў адносяць цэлую групу камянёў з аднолькавымі ўласцівасцямі: піроп, альмандзін, спесарцін, грасуляр, андрадыт, уваравіт. У сярэднявеччы гранаты былі самымі каштоўнымі. Назвалі іх так з-за падабенства з зернем аднайменнага плода (лац.: granatus — зярністы). Усіх іх адрознівае высокая цвёрдасць, прыгожы бляск і афарбоўка.

Самы чысты, яскравы і агністы — піроп. У перакладзе азначае «падобны агню». Яго яшчэ называюць «карбункулам» (вугальком). Піроп лічаць лепшым еўрапейскім ювелірным каменем. Яго радзіма —паўночная Багемія, дзе нават адкрыты музей піропу. У мястэчку Трэбніц захоўваецца самы вялікі крышталь з галубінае яйка. Ёсць яшчэ адна рэліквія — калекцыя ўпрыгажэнняў, якая належала Ульрыцы Левецаў. Іменна ёй вялікі Гётэ прысвяціў адзін са сваіх самых лірычных твораў — “Марыенбадскую элегію”. Ёсць у піропа малодшы брат — радаліт, колер яго бледна-ружовы. А вось бліжэйшы родзіч, які па праву займае другое месца ў гранатавым ізаморфным радзе — альмандзін. Ён, як правіла, у прыродзе сустракаецца ў выглядзе прыгожых, вялікіх крышталёў. Колер іх густа-чырвоны з ліловым і бэзавым адценнямі ці фіялетава-чырвоны. Іх любяць калекцыянеры і ювеліры, таму зараз сустракаецца многа вырабаў з гэтага каменю. Радовішчы альмандзіну даволі распаўсюджаны (Шры-Ланка, Індыя, Бразілія, ЗША, Расія).

Значна менш у прыродзе сустракаецца спесарцін. Назва паходзіць ад месца першай знаходкі — Шпесарт, што ў Баварыі. Колер аранжавы ці буравата-чырвоны. Прыгожыя спесарціны можна знайсці на Урале побач са знакамітымі ізумрудамі, але самыя прывабныя і таямнічыя знаходзяцца на Мадагаскары.

Яшчэ адна разнавіднасць гранату — грасуляр, у перакладзе азначае “агрэст”. Рудавата-зялёныя “ягадкі” для агранкі не зусім прыдатныя, але даволі папулярныя ў мінералагічных калекцыях. Разнавіднасць грасуляру з гіяцынтавым адценнем — гесаніт. Найпрыгажэйшыя гесаніты прывозяць з Шры-Ланка, Канады і Мексікі.

Нельга абысці ўвагай самы цёмны, чырвона-буры ці жаўтавата-карычневы гранат — андрадыт. У прыродзе ён утварае крышталі ці зярністыя масы. Прыгожыя ўзоры сустракаюцца ў Нарвегіі, Румыніі і Каліфорніі. У некаторых з іх можа быць дамешак тытану, і колер тады амаль што чорны. Такія “элегантныя” гранаты называюць меланітамі і шарламітамі. А як прыгожа зіхацяць самыя вясёлыя і яскравыя з гэтай групы — дземантоіды! Назва паходзіць ад лацінскага diamantis (алмаз). Іх бляск асабліва праяўляецца пасля агранкі. Камень можна лічыць чыста расійскай каштоўнасцю. На Урале, ў раёне ракі Бабраўка і каля Ніжняга Тагіла, знаходзіцца амаль што адзінае ў свеце радовішча. Дарэчы, у гранатавым бранзалеце Жалткова, аб якім распавядае Купрын, быў менавіта дземантоід. У Італіі сустракаецца тапазаліт, вельмі блізкі яго родзіч і таксама рэдкі гранат.



Непараўнальна прыгожы ізумрудна-зялёны гранат завецца уваравітам. У гонар графа С.С.Уварава, прэзідэнта Санкт-Пецярбургскай Акадэміі навук. Яскравы і ўстойлівы колер уваравіту забяспечвае хром. Называюць яго яшчэ уральскім “ізумрудам”. Упершыню камень знайшлі на Урале. Саранскае радовішча вядомае і сёння. Крышталікі ўваравіту не бываюць вялікімі, часцей 1 — 2 мм. Выкарыстоўваюцца ўваравітавыя шчоткі як дэкаратыўны матэрыял для ювелірных упрыгажэнняў. Здабываюць камень у ЗША, Эфіопіі, Паўднёва-Афрыканскай Рэспубліцы і Фінляндыі.

Валянціна СМАЛЯКОВА.

КАЛІ цямрэча насунулася на лес, ахутала густым мрокам дрэвы, кустэчу, у хвойніку, які стаяў на невысокім пясчаным грудку, нешта зашамацела, трэснула сухая галінка. З чорнага пралазу нары няўклюдна выпаўз дзіўны звер. У яго вузкая доўгая морда, шчокі, бакі шараватыя, лапы кароткія. Звер вельмі асцярожны: панюхаў паветра, прыслухаўся да наваколля, агледзеўся. Было ціха, толькі ўнізе пагорачка вурчаў звілісты лясны ручай, які абвіваў узвышак і ўшываўся далей у густое кустоўе. Але гэтае цурчанне не насцярожыла звера, гук звычны для яго. Не ўчуўшы небяспекі, начны паляўнічы на сваіх кароткіх лапах споўз уніз па адхоністым утравелым схіле, спрэс усланым шыгаллем, пацерабіўся ў сырую лясную гушчэчу. Нізка апусціўшы галаву-клін, вандроўнік пасоўваўся далей у лес, абмінаў кусты, камлі дрэў, старыя абымшэлыя пні, паваленыя сасонкі і бярозкі.

Начны паляўнічы

Гэта барсук, тоўсты, тлусты і непаваротлівы звер, прагаладаўся і выйшаў на паляванне. Цэлы дзень ён адпачываў у сваёй цёмнай нары і цяпер быў рады любой здабычы, якая трапіцца на яго шляху. А рознай ляснай драбязы ў нізкаватым сырым лесе было шмат. У нізовінцы сярод густой травы зазявалася жаба — не паспела запаўзці ў куст, і барсук спрытна ўхапіў яе. Зашамацела ў апалым лісці рыжая лясная мыш, і лясны ненажэра ўмомант расправіўся са здабычай. На палянцы пад дубам звер паласаваўся жалудамі, якіх не паспелі падабраць дзікі, каля гнілога пня схрумстаў учарнелы чарвівы грыб. Усё даспадобы барсуку, усё яму ідзе на карысць.

А накіроўваўся начны паляўнічы на старую высечку, на якой тырчалі шырокія струхлелыя пні. Першым прыкмеціў іх дзяцел. Учуў хітрун, што ўсярэдзіне мноства розных казюрак пахавалася на зіму, усю раніцу цюкаў моцнай дзюбай, павыцягваў доўгім языком шмат лічынак жукоў-дрывасекаў, іншай спажывы, але раскляваць пень не змог. Толькі больш моцны звер разорыць дашчэнту пень, тады дзятлу, іншым птушкам раздолле. Злятаюцца з усяго наваколля і балююць.

Барсук дапяў урэшце да высечкі, але не спяшаўся прыступіць да вячэры — наперадзе ноч, паспее, да крыху голад наталіў, калі брыў сюды. Прысеў адпачыць, бы лесаруб перад цяжкай працай. Потым моцнымі лапамі з вострымі кіпцюрамі пачаў драць трухляцце, з асалодай выбіраць прысмакі. Барсук, як і дзяцел, вельмі любіць белых, тлустых лічынак дрывасекаў. Праз паўгадзіны ад пня нічога не засталося, толькі валяліся трэскі ды гнілое ашмоцце. Разгарэўся апетыт у барсука, расправіўся і з другім пнём. Ды, вядома, звер усіх лічынак і казюрак не падбярэ ў цемнаце, і птушкам, якія прыляцяць раніцай, застаецца пачастунак.

Пад раніцу звер, сыты і задаволены, вярнуўся ў сваю нару. У гэтую познюю восеньскую пару шмат работы і клопатаў. Трэба як мага больш назапасіць тлушчу, каб перажыць доўгую і суровую зіму, падрыхтаваць цёплую і ўтульную пасцель у нары. Не любіць звер спаць на голай зямлі. Як толькі дрэвы скінуць лісце, барсук чакае, пакуль яно высахне на доле, і тады ўвішна цягае ў нару. У гэты год звер ужо зрабіў сабе пасцель, цяпер вырашыў уцяпліць жытло. На лясным балотцы, з якога выцякае ручай, нагроб моху-сфагнуму і прывалок яго ў нару. Ведае, хітруга-гаспадар, што ад моху гінуць розныя мікробы, не заводзяцца дробныя паразіты. Барсук таксама не паленаваўся паслаць у нары сухую траву.

Ды і гэта не ўвесь клопат. У сваю кладоўку руплівец нанасіў рознага насення, карэньчыкаў, нацягаў нават жалудоў, жабак, якіх высушыў на восеньскім сонцы. Хоць узімку звер спіць моцна, асабліва ў маразы, але ў адлігу можа і прачнуцца. Тады і ласуецца прыпасамі. А пад вясну, калі выблісне сонца, то вылазіць з нары, дыхае свежым паветрам, адпачывае і зноў залягае ў спячку. Дзівосны звер!

Напрадвесні выдаўся сонечны дзень, пацяплела. Прачнуўся барсук, зразумеў, што ў лесе пацяплела, выпаўз на вольнае паветра. Гаспадар нары прыкмеціў, што на дальнім аднорку ягонага жытла завіхаюцца два лісы. Нахабнікі не хаваліся, на барсука ніякае ўвагі не звярнулі. Здаравенны рыжы ліс-самец лапамі разграбаў снег, спрабаваў дабрацца да аднорка, а ліска з цікавасцю назірала. Здагадаўся барсук, што лісы мецяць у яго кватаранты, самі лянуюцца выкапаць нару, кваляцца на гатовую. Паселяцца, народзяць шчанюкоў, а тыя будуць вішчаць, сваволіць, не дадуць спакойна жыць. Няпрошаныя госці вельмі неахайныя, такога смуроду напусцяць, што трываць няможна. І іх нізавошта не прагоніш, будуць жыць, колькі пажадаюць. Хоць барсука яны не крыўдзяць, жывуць мірна з гаспадаром нары, суседства такое не даспадобы. Чысцюля не можа ўжыцца з мурзамі.

Пагараваўшы, барсук зноў заснуў. Разбудзіў яго віскат лісіных шчанюкоў. Звер цярпеў кватарантаў усё лета, бо не было куды падацца. Начамі бегаў карміцца, і заадно падшукваў мясціну, каб перасяліцца, выкапаць сабе новую нару.

Барсукі выбіраюць жытло старанна. Каб мясціна была высокая, сухая, вакол густы лес, ручай ці якое азярцо непадалёк, ды і каб ніхто не трывожыў. Пасля доўгіх пошукаў звер натрапіў на невыскі пагорак, зарослы лесам і хмызам. Пачаў капаць нару. З першавосеньскімі халадамі справіў наваселле, уцяпліў нару, як і раней, зрабіў запасы.

Пра нахабнікаў ліс нават не ўспамінае. Ноччу выходзіць на паляванне, часам забрыдае на старую высечку, дзе яшчэ засталіся пні, жыве ціха і мірна.

Жук — звычайны дварняк, але рослы, кемлівы і адважны сабака. Масць у яго чорная, толькі кончык хваста белы. Звычайна Жук увесь час знаходзіцца на прывязі і ўдзень, і ўночы — тоўсты дрот гаспадар, стары Хведар, навесіў на прасторным двары, і Жук на ланцугу бегаў ад варот да хлява. Ніхто з чужых не мог ступіць на двор. Толькі добрым знаёмым гаспадара дварняк дазваляў адчыніць брамку і брэхам папярэджваў Хведара пра з'яўленне госця. Калі ж у двор сунуўся незнаёмец, то Жук з пагрозлівым гырчаннем бег да брамкі, папярэджваў госця адрывістым, з прыдыханнем, гаўканнем: маўляў, не сунься далей, а то парву штаны.

Сутычка з драпежнікам

Нярэдка з гаспадаром Жук выпраўляўся ў лес па сушняк для распалкі дроў. Так было і ў тую марозную раніцу. Сняжок дзе-колечы прыцерушыў зямлю, быццам шэрань упала, але дарога не была прысыпана. Таму Хведар змазаў колы каляскі, падправіў сякеру, адшукаў ручную пілу. Разумны сабака добра ведаў, што калі гаспадар збірае гэтыя рэчы, то пасля снядання рушыць у лес.

Жук не зводзіць позірку з Хведара, час ад часу ціхенька павісквае ў прадчуванні цікавай прагулкі. Паснедаўшы, гаспадар выходзіць з хаты, выкочвае каляску на сярэдзіну двара, адвязвае сабаку. Ад радасці Жук падскоквае, з віскатам носіцца вакол Хведара, вылятае на вуліцу і імчыць да масціка, які перакінуты праз павілястую нешырокую рачулку, што аддзяляе поплаў ад лесу. Тут ён чакае гаспадара.

На гэты раз Хведар забрыў далей у гушчар, дзе шмат буралому, сухастою. Лес густы, глухі, пасыпаны рэдкім сняжком, бы спіць. Ды гэта толькі здаецца. Нешта, відаць, учуўшы, Жук некуды знік — у яго свой клопат у лесе.

Хведар аблюбаваў тонкую сухадрэвінку-хвойку, ссек яе, пілкай разрэзаў на паленцы, каб лацвей везці, уклаў іх на каляску. Выцягнуў з ламачча сухую яліну, прыкінуў, як разрэзаць і вырашыў адпачыць. Прысеў на пянёк, задыміў.

У гэты час Жук гойсаў па лесе, нізка апусціўшы галаву, унюхваўся ў лясныя посцілі. Відаць, заюравала кроў далёкіх і невядомых продкаў паляўнічых. Натрапіў на зусім свежы след птушкі, прыпыніўся і скочыў да шырокага куста. Па той бок выскачыў рабчык, невялікая рабенькая з чорнымі палоскамі птушка, хуценька пабег прэч, каб сябе не выдаць. Жук, вядома, не ведаў, якая гэта птушка, абабег куст, прыпусціў следам. Але хітры рабчык, прыкмеціўшы, што чорны звер яго ўбачыў, падскочыў угору, часта залапатаў крыламі, нізка шуснуў далей ад бяды, схаваўся ў голлі яліны, заціх. Сабака задраў угору морду, незадаволена забрахаў і панёсся ў гушчар.

Выскачыў на нешырокую прасеку, спыніўся, прыслухаўся: удалечыні чуўся стук сякеры — гаспадар, відаць, абсякаў сукі. Жук задаволена ўзмахнуў хвастом, збочыў у гушчарняк, вырашыў абследаваць балацявінку, якую пачуў па паху. Не паспеў выскачыць на паляну, як ад нечаканасці прысеў на заднія лапы: зверху нёсся такі звонкі стракат, бы добры дзесятак трашчотак адначасова запрацавалі. Чорнага звера ўгледзела зоркая пляткарка-сарока і папярэдзіла лясных насельнікаў пра небяспеку. Яна зляцела з вяршаліны бярозы, дзе дагэтуль сядзела, скокнула на ніжні сук сасны, скасавурылася на сабаку і зноўку пранізліва закрычала. Драпежнік убіўся на яе тэрыторыю, і яна імкнулася прагнаць яго.

Жук, каб схаваць свой канфуз, падскочыў угору, клацнуў зубамі, злосна брахануў на птушку, але тая, бы насміхаючыся з сабакі, няспешна спырхнула ўніз, кораценька страканула і, мільгануўшы над кустом ядлоўцу, рэзка ўзвілася ўверх. На крык сарокі прыляцела сойка, абурана закрычала, убачыўшы чорнага незнаёмага звера. Але Жук не звярнуў на птушку аніякай увагі — усё роўна не дагоніш і не ўхопіш зубамі. Яму падабалася бегаць па лесе, удыхаць пахі апалага лісця, шыгалля, сляды звяроў і птушак.

Жук даў добрага кругаля, абабег невялікае балотца, пакрытае бурай травой і ўжо прымерзлае, выправіўся на стук сякеры гаспадара, які ледзь быў чуцён. Раптам сабака ўчуў едкі, варожы дух, які пакінуў на слядах нейкі лясны звер. Жук не ведаў, хто тут прайшоў, але звярынае чуццё, якое ў небяспечныя хвіліны прачынаецца ў кожным драпежніку, падказалі яму, што гэта вораг. Сабака міжволі падняў хвост, бо стала боязна, але ж некаторы час бег па слядах. Яны вялі ў той бок, дзе завіхаўся гаспадар.

Вялізны мядзведзь, які чамусьці не залёг у бярлогу, шастаючы па лесе, пачуў стук сякеры, шоргат пілы і наўпрасцяк павалокся на гэтыя гукі. Звер быў галодны, бо знайсці які спажытак у апусцелым лесе нельга. У гэтых лясных нетрах мядзведзь лічыў сябе гаспадаром, і вось нехта адважыўся ступіць на яго тэрыторыю. Звер нячутна наблізіўся да чалавека, узняўся на заднія лапы, злючымі вочкамі сачыў, як той працуе.

А Хведар падцягнуў апошняе бярвенца да каляскі, разагнуўся і ледзь не самлеў: ля камля яліны на задніх лапах стаяў мядзведзь. Ён пагрозліва раўнуў, з нечаканым спрытам скочыў наперад. Хведар ад страху падаўся назад, але зачапіўся за каляску, пахіснуўся, і гэта мо выратавала яго. Звер лапай нанёс страшны ўдар, амаль да пояса вострымі кіпцюрамі разарваў ватоўку і вось-вось усім сваім цяжарам наваліцца на ахвяру, як раптам шалёна ўзвыў ад болю, адвярнуў убок пашчу, з якой вырываўся смурод. Жук паспеў своечасова, з ходу, не раздумваючы ўчапіўся зубамі ў заднюю лапу драпежніка. Мядзведзь скочыў назад, але сабака аказаўся спрытнейшым, умомант адбегся, злосна забрахаў.

Хведар адпоўз убок, хацеў узняцца на ногі, каб ратавацца ад раз'ятранага драпежніка, але той з ровам зноў кінуўся на чалавека. Жук і тут не разгубіўся — і на гэты раз выратаваў свайго гаспадара, балюча ўкусіў драпежніка за сцягняк. Мядзведзь не вытрымаў такога нахабства ад дварняка, якога мог зваліць адным ударам. Ломячы кусты, папёр напрасцяк за сабакам, але спрытнюга Жук быў напагатове, вёртка пасігаў у гушчар, лавіруючы між камлёў дрэў. Калі драпежнік трохі адстаў, Жук спыніўся, злосна забрахаў на звера, памкнуўся наперад. Мядзведзь зразумеў, што спробы дагнаць нахабніка марныя, прысеў на заднія лапы, раўнуў і падаўся ў гушчарняк. Сабака суправаджаў яго лютым брэхам, часам кідаўся на звера, але блізка не падыходзіў.

А Хведар тым часам з цяжкасцю ўзняўся з долу, кінуўся да ўзлесся, раз-пораз задыхана азіраючыся. Дапяў да мастка, неяк перабраўся на другі бок, знямогла апусціўся на дарогу. Трохі аддыхаўся, прыслухаўся: у лесе, удалечыні ледзь чуўся сабачы брэх. "Жывы, значыць, Жук, — мільганула ўцешная думка. — Адагнаў звера, малайчына. Ды каб хаця вярнуўся? А каляска чорт з ёй, акрыяю — забяру." Як крыху адышлі ногі, падняўся з долу, аберуч абапёрся на жэрдачку парэнчаў, зірнуў уніз, на тонкі лядок, пасярэдзіне падмыты плынню, уздыхнуў...

Раптам з бярозавага ўзлеску куляй вылецеў Жук, узбуджаны, радасны, падскочыў да гаспадара, лізнуў у руку, тонка віскануў. Хведар схіліўся, абняў сабаку за шыю, прашаптаў:

— Жывы? Не збаяўся звяругі, адагнаў... Нехта падняў яго з бярлогі. З запаведніка, відно, прыцягнуўся. Нічога, уратаваліся. Пойдзем дадому.

Жук з радасным віскатам панёсся па дарозе. Услед цягнуўся Хведар, цяжка ўздыхаючы ад усяго перажытага ў гэтую раніцу. "Добра, што ўзяў у лес сабаку, а так была б хана мне", — думаў ён.

Алесь ДЗЯТЛАЎ.





Лишайники

Берендеево царство

В удивительный, сказочный лес мы попали. Вокруг не просто деревья, не просто пни, не просто камни, а сказочные деревья, сказочные пни, сказочные камни. И делают их такими лишайники. Смотришь, но не можешь насмотреться, веришь, но все равно сомневаешься — правда ли? Вот на стволе снизу и доверху ажурный зеленый покров, он и на ветках, даже на самых тонких. Как будто дерево аккуратно оделось в мягкую живую шубу, окунув в нее все свои веточки. Это лишайник гипогимния поселился на дереве. Прижился. Разросся. И уже не видно под ним коры. А на другом дереве отдельными узорчатыми нашлепками красуется лишайник пармелия. Он серо-зеленый, плоский, как будто вырезан из смятой бумаги.

А вот желто-оранжевый, заметный издалека лишайник стенная золотянка, или ксантория. Она действительно по цвету золотая, горит на стволе так ярко, что кажется непонятным, почему не блестит. Словно не природа ее сотворила, а умелый ювелир...

Вот с ветвей свисают косматые «бороды» и «парики», серые, зеленые и серо-зеленые. Тут прямо-таки костюмерная лесного царя. Так и хочется что-нибудь достать и примерить. Только не для нас это все здесь развешано... Бороды и парики — лишайник уснея.

А под ногами мягкие подушки — лишайник кладония. Если к такой подушке присмотреться, видно, что она состоит из множества кустиков, даже не кустиков, а игрушечных деревьев, каждое из которых легко поместится на ладони. Есть тут и другие подушки. Кустики, из которых они составлены, имеют плоские веточки, они больше похожи на какие-то водоросли. Это лишайник цетрария.

А пни-то, пни-то как богато украшены! Приглядишься к такому пню, и кажется, что растет на нем целый лес. И весь он из непонятных, фантастических растений. Для того жучка, который пробирается по пню среди лишайников, это и есть настоящий лес. Пробирается жучок среди «деревьев», похожих то на какие-то серые бокалы с красными «плодами» по краям, то на огромные зеленые иголки, возвышающиеся над всем «лесом», то на гигантские многоэтажные грибы с коричневыми шляпками, то на грибы обычные, то на что-то совсем уж фантастическое, такое, к чему и сравнения не подберешь...

На камнях другие лишайники — похожие на накипь... А на подстилке из мха пристроились лишайники, напоминающие листья, упавшие с деревьев. Одни из этих «листьев» зеленые, другие серые, третьи бурые...

Вот в какой лес мы сегодня отправимся. В берендеево царство. В царство лишайников.

Накипные, листоватые и кустистые

Разных лишайников на свете очень много — примерно 6 тысяч видов. Живут они на Земле повсюду: есть в Арктике, в Антарктике, есть в высоких горах, в жарких пустынях, в тропических лесах, в тайге...

Тело лишайников называется слоевищем. Какими разнообразными, причудливыми бывают слоевища, мы уже знаем. И окрашены они в самые разные цвета: белые, ярко-желтые, оранжевые, розовые, красноватые, голубоватые, серые, оливковые, коричневые, черные...

Три группы выделяют среди лишайников по строению их слоевища: накипные, листоватые и кустистые.

Тонкая корочка, полностью сросшаяся с той поверхностью, на которой она разместилась, — это лишайник накипной. Его можно увидеть на коре дерева, на почве, на камне, на скале. Если попробуете эту корочку снять, оторвать, ничего не получится, только повредите лишайник. Бывает, что слоевище почти совсем врастает в камень или в кору. Не всегда эти лишайники похожи на накипь: корочка их может быть гладкой (правда, редко), а может иметь вид порошка.

Листоватые лишайники похожи на листочки, а иногда их тело состоит как бы из множества листочков. Оно плоское, стелется по поверхности камня, дерева, по другой какой-нибудь поверхности, прикрепляясь нитями — ризоидами, напоминающими маленькие корешки. Листоватый лишайник обычно можно отделить от поверхности, он связан с ней непрочно. Пельтигера, гипогимния, ксантория, пармелия — это все листовые лишайники.

А вот кладония, цетрария, уснея — лишайники кустистые. Они не стелются, а стоят на поверхности. Или свисают сверху вниз бородами. Кустистые лишайники из всех лишайников самые высокоорганизованные. Размеры их бывают разными. Одни — крошки высотой всего несколько миллиметров. Другие — великаны, достигающие полуметрового роста. Но самые невероятные гиганты — среди лишайников-бородачей. Рекордсменки среди них уснея длиннейшая (и название соответствующее!). Она образует «бороды» длиной 7 — 8 метров! Растет уснея длиннейшая в тайге.

Очень оригинальная группа лишайников, о которой хочется сказать особо, — слизистые лишайники. Они бывают накипными, листоватыми и кустистыми. Но все отличаются ни с чем не сравнимой любовью к воде. Во время дождя впитывают воду в огромных количествах — в 20 — 30 раз больше, чем весят сами. В сухом виде они обычно темные или черные, твердые, ломкие, а во время дождя совершенно преображаются — сильно разбухают и превращаются в зеленоватый студень.

Все лишайники, о которых шла речь — «оседлые». Есть, однако, небольшая, но удивительная группа «кочующих» лишайников. В Монголии живет пармелия блуждающая. Блуждает она всю свою жизнь. Малейшего дуновения ветра достаточно, чтобы пармелия переместилась на другое место. Пармелия блуждающая представляет собой комочки зеленовато-черного цвета. Это листоватый лишайник, но ни к почве, ни к камням, ни к чему-либо другому никогда не прикрепляется.

Как научиться жить на стекле

Большинству растений для нормальной жизни нужна почва. Из нее они извлекают необходимые питательные вещества. Лишайникам же почва в принципе не требуется. Недаром они живут на голых скалах, на

коре деревьев... Могут поселиться на бронзовом памятнике, на стекле, пристраиваются, например, на витражах старинных соборов... Живут на стенах и крышах зданий... Одним словом, они могут поселиться на чем угодно, лишь бы это что-то было неподвижным. Однажды лишайник пристроился на панцире гигантской слоновой черепахи с Галапагосских островов! Причем на живой черепахе, а не на панцире погибшей. Черепаха, конечно, двигалась, но ведь «черепашьим шагом»...

Секрет такой «нетребовательности» лишайников кроется, вероятно, в их удивительной природе, в том, что каждый лишайник — это не одно растение, а два. Два, причем друг на друга совсем не похожих, — гриб и водоросль.

Конечно, грибы в лишайниках — это совсем не те, которые мы собираем в лесу. Лишайниковые грибы — особые, не могут жить самостоятельно, без водоросли, и не встречаются вне тела лишайников. Они представляют собой многочисленные очень тонкие нити, примерно такие же, как находящаяся в почве грибница обычных грибов. Мы, как известно, эту грибницу не видим, а видим так называемые «плодовые тела», которые и собираем. Интересно, что и лишайниковые грибы могут образовывать плодовые тела — черные, коричневые, красные, оранжевые. Они очень украшают лишайник. Заметить их нетрудно, надо только внимательно рассмотреть растение. В плодовых телах находятся споры гриба.

Водоросли в лишайниках проживают в окружении грибных нитей. Эти водоросли обычно одноклеточные. Некоторые из них могут жить и самостоятельно, а другие — только в союзе с грибом.

В таком союзе гриб получает от водоросли органические вещества, которые она производит на свету, как это делают все зеленые растения. А водоросль берет у гриба воду и минеральные соли.

Воду с растворенными в ней солями лишайниковый гриб добывает из окружающей его среды. Это дождевая вода, вода тающего снега, роса... Однако он способен впитывать влагу прямо из воздуха, даже если воздух сухой, с влажностью не более 50 процентов.

Поверхность же, на которой лишайник живет, служит ему только местом прикрепления. Не исключено, правда, что в ряде случаев лишайник все же извлекает из этой поверхности какие-то дополнительные питательные вещества.

Так или иначе, но лишайники способны поселяться в самых безжизненных, самых бесплодных местах. Здесь они — пионеры, первопроходцы растительного мира. Отмирая, образуют перегной, на котором могут потом поселиться другие растения. Первым всегда трудно. Но лишайники справляются. И заслуживают за это глубокого уважения.

Падарожнічаць можна па-рознаму: на цягніку і аўтамабілі, на сваіх дваіх ці на веласіпедзе, з рукзаком за плячыма наведваць мясціны роднай краіны ці прымаць сонечныя ванны дзесьці на марскім узбярэжжы. Я запрашаю вас у падарожжа, дзе гідам будзе мастацкае слова, спадарожнікам — ваша ўласнае ўяўленне і фантазія, а аб'ектамі вандроўкі — не марскія замежныя краіны, а куткі роднай Беларусі.

Замалёўкі вандроўніка

Вясковыя абразкі

Выходжу з рэйсавага аўтобуса і, уздыхаючы з палёгкай, лагодна азіраю знаёмыя мясціны. Збочваю з шашы на гасцінец і накіроўваюся да пагорка, з-за якога нясмела выглядваюць вострыя верхавіны дахаў. Там пачынаецца вёска Багрынава, што на Талачыншчыне, — мой родны куток.

Зімовая рапсодыя

Невялічкая вясковая вуліца сустракае маркотнай пустэчай і нязвыклай цішынёй. Толькі зрэдку гэтую маўклівую заспакоенасць парушае прарэзлівы сабачы брэх ды гучныя спевы гарластага пеўня.

— Рып-рып, — бадзёра паскрыпвае пад нагамі снег. Паабапал дарогі, нібы надзейныя вартавыя, узвышаюцца высокія ліпы і магутныя дубы, беражліва трымаючы на галінах прыгожае зімовае ўбранне. Сарамяжліва пазіраюць шыбамі невялікіх акенцаў несамавітыя вясковыя хаты. А побач, на прасторы шырокіх палеткаў, — бязмежная роўнядзь снежнага наваколля. Нібы мора, нібы акіян — не бачна ні канца ні краю. Дзіўная прыгажосць!

Выйдзеш увечары з хаты, калі цёмна-сіні начны змрок пяшчотна ахіне зямлю, а паветра зробіцца па-марознаму свежым, і, здаецца, быццам застаўся адзін у цэлым сусвеце, сам-насам з уласнымі думкамі. Няма больш нікога ў гэтым змрочным асяроддзі, акрамя агеньчыкаў суседскіх хат ды блакітных зорак, якія з цікавасцю паглядаюць на зямлю. І раптам разумееш, што, толькі сутыкнуўшыся з хараством прыроды, пачынаеш шанаваць яе веліч і прыгажосць.

Рачулка дзяцінства

Каля вёскі, у неглыбокім раўку, туляецца невялічкая рачулка Лагаўка. Як быццам і недалёка яна, а пройдзеш па завеянай, ледзь прыкметнай сцежцы, тонучы ў глыбокім, рыхлым снезе, — адразу чырванее твар, празрыстай парай вырываецца з грудзей глыбокае дыханне — нібыта адмераў пешкі не адзін дзесятак кіламетраў.

Каля старой, счарнелай ад часу кладкі схіліўся над лункай рыбак.

— Дзень добры! — вітаюся. — Як справы?

— Ды грэх скардзіцца, — адказвае аматар рыбалкі.

Зусім нечакана ён рэзка ўздымае вуду, пачынае жвава перабіраць рукамі леску і выцягвае з вады ладнага акуня. На ружовым, маршчыністым твары з'яўляецца лагодная ўсмешка:

— Юшка добрая будзе.

— Чым жа прывабілі рыбнае насельніцтва?

Стары хітра прыжмурыў вочы і, адчапіўшы акуня, кінуў здабычу на лёд. Сярдзіта растапырыўшы калючыя плаўнікі, рыбіна збянтэжана пазірае на нас жоўта-чорнымі вачыма, час ад часу павольна варушыць губамі, нібыта намагаючыся нешта паведаміць.

— Ды вось дрыгаю спаквал мармышкай — яны і чапляюцца.

Хітры стары. Не жадае адкрываць свае сакрэты. Ды я не крыўдую. Жадаю рыбаку поспехаў і нетаропка рухаюся далей па звілістым рэчышчы. У самотным спакоі, якім павявае ад ракі, неяк журботна робіцца на душы пры адчуванні непазбежнага надыходу вясны. Калі гэты спакой будзе парушаны сеткамі, "тэлевізарамі", электравудамі ды іншымі прыладамі прыхільнікаў лёгкай спажывы.

Рэха гісторыі

Стаю на старым замчышчы за вёскай, пазіраю ў змрочную далячынь. Вось там, ля пагорка, дзе шэрай сцяной узвышаюцца дрэвы, быў калісьці панскі маёнтак. Ён належаў вядомаму роду Тушынскіх. Яны засялялі гэтыя землі яшчэ ў часы Рэчы Паспалітай.

Крыху воддаль — тры курганы. На Віцебшчыне іх завуць валатоўкамі. Паданне гаворыць, што тут ляжаць людзі-волаты. Яны да апошняга змагаліся за сваю зямлю, веру, не давалі ворагам узяць у палон сваіх жонак і дзяцей, братоў і сясцёр. Побач жоўтай стужкай уецца шаша, па якой раз-пораз з натужлівым фырканнем соўгаюцца аўтамабілі. Дзіўная сувязь мінулага і сучаснасці. Так і наша жыццё. Яно саткана з дня мінулага і сённяшняга. Калі ж якое-небудзь звяно выпадае з ланцужка часу, мялее крыніца жыцця не проста вёскі ці горада, а ўсяго народа. Таму і хочацца дайсці да драбніц, да таго ручайка, з якога бярэ пачатак кожная вялікая рака. А зразумеўшы — не толькі шанаваць, але і захоўваць спадчыну, якая дайшла да нас, каб перадаць удзячным нашчадкам.

Сяргей ГУСАЧЭНКА.

Сяргей Васільевіч Зуёнак — пастаянны аўтар і даўні сябар нашага часопіса. Нядаўна ў выдавецтве "Мастацкая літаратура" выйшла яго кніга "Птушкі. Крылатыя песні зямлі". "Родная прырода" друкуе некаторыя яе старонкі.



Нашы зімовыя суседзі

Зімовай парой у новабудоўлях буйных гарадоў, якія мяжуюць з пустэчамі і палямі, у дварах і на прыпынках грамадскага транспарту можна сустрэць буравата-шэрых чубатых птушак, крыху драбнейшых за шпака. Гэта жаўрукі-смецюхі. Ніколькі не асцерагаючыся людзей, яны круцяцца літаральна пад нагамі, збіраючы розныя смачныя дробязі, што заўсёды можна знайсці ў такіх месцах. З надыходам вясны забаўныя чубатыя птушкі знікаюць з двароў і прыпынкаў, але далёка не адлятаюць, перасяляюцца на бліжэйшыя пустэчы альбо нават на ўзвалкі дарог на гарадскіх ускраінах, дзе і выводзяць птушанят. Яшчэ пару дзесяцігоддзяў назад жаўрукі-смецюхі былі даволі звычайнымі птушкамі для нашых населеных пунктаў, зараз жа з кожным годам іх становіцца ўсё менш і менш. Прычынай гэтага лічыцца павелічэнне колькасці дамашніх сабак, месцы выгулу якіх супадаюць з гнездавымі ўладаннямі жаўрукоў.

